2

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 9 (391) Серада, 19 студзеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 90. | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвонай Зьмены. Менск, Комсам. 25.

Вывучайце пастановы X-га зьезду КП(б)Б

(Рэзолюцыя пленуму ЦК ЛКСМБ па дакладу аб выніках X зьезду КПБ).

1) Заслухаўшы даклад т. Галадзеда аб працы X-га зьезду КПБ, Пленум ЦК ЛКСМБ цалкам і поўнасьцю прылучаецца да пастаноў зьезду, лічачы, што пытаньні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва БССР, пытаньні нацыянальнай політыкі і ўнутрыпартыйнага будаўніцтва, атрымалі сваё поўнае і правільнае вырашэньне ў пастановах зьезду КП(б)Б.

2) Выходзячы з таго, што пастановы зьезду падагулілі важнейшыя пэрыоды у разьвіцьці політычнай і організацыйнай работы КП(б)Б, а так сама намечаны далейшыя шляхі практычнай работы па соцыялістычнаму будаўніцтву пленум ЦК ЛКСМБ падкрэсьлівае перад усёй організацыяй ЛКСМБ настойлівую неабходнасьць усебаковай прапрацоўкі усіх пытаньняў і пастаноў зьезду.

Пленум даручае Бюро ЦК ЛКСМБ вызначыць парадак і паказаньні для ўсіх організацый па прапрацоўцы гэтых пытаньняў.

Пытаньні 4-й сэсіі ЦВК Беларусі

(Вытрымкі з артыкула А. Г. Чарвякова)

18-га студзеня пачынае сваю працу чарговая (4-я) сэсія ЦВК Беларусі.

Пры дапамозе Саюзу ССР Беларусь мае у сёлетнім годзе значнае павялічэньне бюджэту як у даходнай так і выдатковай сваей частцы.

Асаблівасьцю бюджэту сёлетняга году трэба лічыць тое, што пры разьмеркаваньні сродкаў галоўная ўвага была зьвярнута на палепшаньне якаснага боку працы коштам некаторага пасаблепьня яе колькаснага росту.

На сэсіі будзе стаяць даклад Народнага Камісарыяту Замежнага і Унутранага Гандлю, а таксама даклад аб чарговых задачах па разьвіцьцю дзяржаўнай і мясцовай прамысловасьці.

Гэтыя два пытаньні важны ў тых адносінах, што яны павінны будуць выявіць: дзяржаўнае рэгуляваньне рынку у сэнсе устанаўленьня нармальных суадносін паміж цэнамі прадуктаў сельскай гаспадаркі і прамысловасьці; забясьпечанасьць рынку таварам; мерапрыемствы па рэгуляваньню цэн і інш.

Разьвіцьцё дзяржаўнай і мясцовай прамысловасьці ў Беларусі складае частку агульна-саюзнай задачы забясьпячэньня прамысловасьці, якая адыгрывае галоўную ролю у нашай народнай гаспадарцы. Вырашэньне гэтай задачы забясьпечвае утварэньне патрэбных умоў для парушэньня нашай сельскай гаспадаркі на шлях больш шпаркага разьвіцьця. Апрача гэтай экономічнай задачы, разьвіцьцё прамысловасьці дапамагае павялічэньню колькасьці пролетарыяў і гэтым падымае удзельную вагу рабочай клясы ў нашай краіне, політычна узмацняе Савецкую Беларусь, як дзяржаву дыктатуры пролетарыяту.

IV сэсія павінна таксама разглядзець па даручэньню III й сэсіі Кодэкс аб шлюбе, сям'і і апецы і водна-мэліорацыйны кодэкс.

У сучасны момант матар'ялы абгаварэньня законаў на мясцох сабраны, сыстэматызаваны, у законы ўнесены на аснове гэтых матар'ялаў папраўкі, і Савет Народных Камісараў прадстаўляе сэсіі гэтыя законы ў новай рэдакцыі.

Апроч гэтых дзелавых пытаньняў якія будуць разглядацца сэсіяй, неабходна адзначыць таксама і політычнае значэньне гэтай сэсіі.

Асноўнае політычнае значэньне IV сэсіі у тым, што яна склікаецца пасьля далучэньня да Савецкай Беларусі Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. На сэсіі мы такім чынам зможам прадэманстраваць як экономічнае, так і політычнае значэньне гэтага факту і падкрэсьліць яшчэ раз, што правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня магчыма толькі ў савецкай краіне.

У зьвязку з гэтым на сэсію прыяжджаюць прадстаўнікі Гомельскага і Рэчыцкага паветаў, пры беспасрэдным удзеле якіх сэсія павінна афарміць далучэньне новых паветаў да Беларусі, а таксама хаця-б ў агульных формах вызначыць задачы далейшага будаўніцтва Савецкай Беларусі.

Такім чынам надыходзячая сэсія можа служыць паказчыкам агульна-экономічнага, культурнага і політычнага росту і ўзмацненьня Савецкай Беларусі, а разам з гэтым і Савецкага Саюзу, неадзрыўную частку якога складае БССР.

Ставім пытаньне аб экскурсіі.

Менск—Ленінград—Кранштадт—Волхаўбуд.

Чакаем водгукаў чытачоў.

Кажучы, аб неабходнасьці прыстасаваньня працы да запатрабаваньняў рабоча-сялянскай моладзі нам менш патрэбны рэзолюцыі, а больш практычнага ажыцьцяўленьня гэтай задачы. Толькі жывымі фактамі, прыкладамі, а галоўнае, абменам вопытам можна зацікавіць моладзь, будзіць не да самадзейнасьці. Адклікаючыся на не запытаньні не забываць, што асабліва ў галіне культурна-масавай працы ўсё трэба будаваць на прынцыпе добраахвотнасьці.

Група Жлобінскіх комсамольцаў (пакуль што іх 10) падалі вусную заяву ў акруговы камітэт ЛКСМБ аб дапамозе ім у наладжаньні з наступленьнем вясны экскурсіі на лодках па машруту Жлобін—Екатарынаслау. Без дапамогі і водгуку на іх жаданьні, а іх зацеі нічога ня выйдзе.

Думаем пачаць падрыхтоўчую працу і мы—бабруйчане гэтую „экспэдыцыю" з'організуем.

Сеязячы ў клюбе гутарачы з хлапцамі наконт экскурсіі рабочай моладзі Масквы ў Ленінград некаторыя казалі „эх добрая штука, ды толькі дзе ўжо нам". Масква—„Цэнтр", „у іх грошай багата, ЦК пад носам".

А што калі паспрабаваць... І трэба сказаць, што за такую цяжкую працу ў умовах Беларусі мы думаем узяцца. Праўда офіцыйна нідзе яшчэ гэта пытаньне ня вырашалі, пакуль што толькі прыступілі да вывучэньня, але-ж упэўнены ў тым, што экскурсію зрабіць можна й даволі прыгожую. Напрыклад: Бабруйск—Ленінград—Кранштадт—Волхаўбуд.

Чакаем думкі „Чырвонай Зьмены" на гэты конт.

Ізакаў.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя зараз распрацоўвае пытаньне аб організацыі экскурсіі рабоча сялянскай моладзі Беларусі па маршруту Ленінград—Кранштадт (падшэфны лінкор „Парыская Комуна")—Волхаўбуд".

Чакаем ад чытачоў водгукаў па гэтаму пытаньню.

Падрабязговы матар'ял будзе зьмешчаны ў адным з чарговых нумароў газэты.

Эвакуацыя ангельцаў з Сычуанскае правінцыі

ПЕКІН, 13 І. У раёне верхняй плыні рэчкі Янцзыцьзяну рух проці ангельцаў павялічваецца. Ва ўсіх чужаземных калёніях Сычуанскае правінцыі праводзіцца падрыхтоўка да эвакуацыі. Брытанскія рэзыдэнты з Шучоў, Лучоў і Юнчуанана ўжо знаходзяцца ў Чункіне.

ПЕРАМОГІ КАНТОНЦАЎ НАД КАПІТАЛІСТЫМІ.

ВЕСТКІ З ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Улада Кантону на цьзюцьзянскіх чужаземных канцэсіях

Кітайскі друк паведамляе, што кантонцы уступіўшы ў Цьзюцьзян, занялі брытанскую і французскую канцэсіі.

Чужаземцы выяжджаюць з мясцовасьцяй вызваленых кантонцамі

Па ўсіх мясцовасьцях у Кітаі, якія заняты кантонцамі, адбываецца вялікі рух проці Англіі. Адбываюцца мітынгі.

У атрыманых паведамленьнях гаворыцца, што становішча ў мясцовасьці Учане таксама напружанае, сем'і ангельцаў і амэрыканцаў адсюль ужо выехалі.

Кантонская ўлада—гаспадар становішча ў Ханькоў. У Ханькоў зусім спакойна.

Француская компартыя вітае кітайскую рэволюцыю

Француская компартыя паслала кітайскай компартыі тэлеграму, у якой вітае барацьбу працоўных Кітаю проці імпэрыялізму і завярае кітайскую компартыю і Гоміндан у шчырай солідарнасьці працоўных Францыі з нацыянальна-вызваленчым рухам Кітаю.

Прыдушэньне паўстаньня на Суматры.

У часе паўстаньня на высьпе Суматры, водлуг афіцыйных паведамленьняў, арыштован блізка 900 чалавек. Кіраўнікі паўстаньня ў большасьці выпадкаў забіты ў бойках. Паўстанцы пахаваліся ў гарыстай мясцовасьці. Ужываюцца захады, каб акружыць іх.

Няудачы Антанты.

Надта вострае „блюда".

У Заходняй Беларусі

Суд над 20 комуністымі.

У віленскім акруговым судзе разглядалася справа 20 беларускіх сялян, якія абвінавачваліся ў організацыі комуністычнай баявой дружыны і ў садзейнічаньні сялянскай партыі.

10 абвінавачваемых апраўданы. Рэштка прыгаворана ад 1-го да 4 год турмы.

Фабрыканты імкнуцца паменшыць плату рабочым.

У Беластоку ўласьнікі гарбарняў запатрабавалі ад рабочых, каб яны адмовіліся ад 12-процантнай надбаўкі, якую атрымалі ў лістападзе. На сходзе рабочыя адхілілі наглыя запатрабаваньні прадпрыемцаў.

Суд над 65 сялянамі.

У хуткім часе ў Гараднянскім акруговым судзе будзе разглядацца справа 65 беларускіх сялян, абвінавачваемых у прыналежнасьці да комуністычнае партыі Заходняй Беларусі і імкненьні адарваць усходнія крэсы ад Польшчы і далучыць іх да Савецкай Беларусі.

„Гэтай мэблі ня трэба".

(Атрымана на міжнароднай мове „эсперанто").

У Галяндыі ёсьць каралева. Кожны год яна прыяжджае ў Амстэрдам атрымаць пэнсію адзін мільён дзьвесьці тысяч гульдэнаў—на нашы грошы каля дзевяцісот тысяч рублёў. Апрача гэтага атрымлівае пэнсію яе муж і дзіцё.

Кожны раз у часе свайго прыезду каралева ўтварае паездкі па гораду, каб паказаць сябе насельніцтву. Раней яе заўсёды спатыкалі ўрачыста. Але, з цягам часу, урачыстасьць гэтая зьменшылася. Замест „каралеўскай песьні" каралева раптам пачула страшную для яе песьню „Інтэрнацыянал".

У гэтым годзе народ, сярод якога было многа беспрацоўных, крычаў:
—Вон гультаёў.

Усё часьцей каралева чуе пры сябе ад працоўнага насельніцтва:

— Нам гэтая мэбля ня трэба.

З жыцьця Амерыкі

«Зладзейскія унівэрсытэты»

Амэрыканскія зладзеі і бандыты на увесь сьвет вядомы „чыстатой" сваёй працы. Даганяюць іх і эўропэйцы. Нядаўна ў Парыжы была выкрыта спэцыяльная школа зладзейства. Былі заарыштаваны «прафэсары», «студэнты» і «вучэбныя падручнікі». Арышт удалося утварыць толькі тады, калі вучні здалі „выпускныя экзамены" абрабаваўшы па суседзтву некалькі дамоў. Гэта і дапамагло знайсьці сьляды школы.

А ў Бэрліне, аказваецца, існавала цэлая „зладзейская акадэмія.

Для гэтай акадэміі быў знойдзен раскошны асабняк і падабраны цэлы штат настаўнікаў, сярод іх і тэхнікі, і ўрачы, і юрысты. У курс навук уваходзілі і вывучэньне грыму, і мастацтва выкладаньня, і стральба з нагану і бокс, і джыу-джытсу, і ўзломы кас, і кішэнныя пакражы, і абрабаваньне сьпячых пасажыраў і ўскрываньне незгараемых кас удасканаленымі спосабамі і г. д.

Арышт бэрлінскай „акадэміі" адбыўся пасьля таго, калі яе кіраўнікі не паладзілі з паліцыяй.

У пакоў сялянства стогне бяз зямлі

Вось што піша аб жыцьці сялянства Заходняй Беларусі віленская газэты „Сялянская ніва" за 12 студзеня № 4 (55).

Сем гадоў таму назад, калі армія Пілсудзкага уцякала з пад Бярэзіны, а Чырвоная армія хлынула на Польшчу, польскі буржуазны панскі сойм выпусьціў уставу аб зямельнай рэформе. Паны не маглі самі абараніцца ад Чырвонай арміі, затым, каб зацвоціць сялян ісьці на вайну, дэклярвалі ім правесьці зямельную рэформу, аддаць часьць сваіх маёнткаў безьзямельным і малазямельным сялянам. Як толькі кончылася вайна, зараз польскія ўлады пачалі пяяць зусім іначай. Праўда, далі сваім жаўнерам зямлі, але не з маёнткаў польскіх паноў, а з маёнткаў і фальваркаў забраных уласьнікаў іншае нацыянальнасьці. Паўстала так званае вайсковае асадніцтва на беларускіх і ўкраінскіх землях. Аб фактычнай зямельнай рэформе, якой дамагаецца экономічны стан вёскі, польскія ўлады не клапаціліся і ня будуць клапаціцца.

З усяго бачым, што кожны новы год жыцьця ў Польшчы не прыбліжае развязку пытаньня аб радыкальнай зямельнай рэформе, а яшчэ аддаляе яе. Першую уставу аб зямельнай рэформе польскі сойм замяніў на іншую, пры гэтым перадусім забясьпечыў інтарэсы паноў-земляўласьнікаў і зусім абмінуў інтарэсы безьзямельных і малазямельных сялян. Другая ўстава аб зямельнай рэформе і асадніцтве з 1925-га году прадбачыць перш-на перш прыватную парцэляцыю за грошы, гэта значыць, што той хто мае грошы, можа купляць ад паноў зямлю. Але ж на такую парцэляцыю не патрэбна ніякай уставы аб зямельнай рэформе! Тут патрэбна такая зямельная рэформа, каб кожны найбяднейшы селянін малазямельны, ці бязьзямельны атрымаў столькі зямлі, сколькі можа ўрабіць. Тымчасам, як бачым, польскія ўрады ня думалі і ня думаюць даць зямлю тым, якія найбольш яе патрабуюць.

Апошні польскі ўрад марш. Пілсудзкага паноў яшчэ далей чымся яго папярэднікі, каб зусім зьнівечыць справу зямельнае рэформы. Паводле на'т папярэдняй уставы кожны год павінна быць распарцэлявана 200 000 па (гэктараў) зямлі. Але ўрад Пілсудскага, у якім сядзяць абшарнікі, ня хоча выконваць і гэтае ўстановы, бо ў сваім распараджэньні аб прымусовым выкупе маёнткаў у бягучым годзе вызначыў да парцэляцыі 350 маёнткаў з абшарам зямлі на агульную суму 49661 hа. З гэтага больш што прадусім будзе прыватная дабравольная парцэляцыя за доляры, або за залатыя рублі, бо абшарнікі інакш не прадаюць зямлі, як за чужыя грошы, а не за свае польскія. З невялічкага ліку 49 тысячаў hа прымусова вызначанай зямлі ад парцэляцыі, ёсьць ведама, малазямельныя сяляне беларусы нічога не атрымаюць, бо ўся яна пойдзе ў рукі палякаў.

Дык вось, гэты год не прынясе нам на'т і маленечкай палёгкі ў справе надзяленьня зямлёй безьзямельных і малазямельных сялян-беларусаў. Наступныя гады будуць такія самыя, бо ў Польшчы пануе ўлада паноў і буржуазіі. Гэтая ўлада будзе бараніць інтарэсы толькі багатых людзей, а бедны селянін і работнік мусіць быць эксплёатаваны праз клясы дармаедаў, якія жывуць коштам працоўнага народу. Хоць, па ліку гэтых дармаедаў, ёсьць шмат менш за тых, што самі працуюць на чорны кавалак хлеба, але, пакуль-што, ўлада знаходзіцца ў іх руках, бо яны ў сваім часе організаваліся і кіруюць усім політычным жыцьцем. Пакуль ўлада будзе ў руках паноў і буржуазіі, датуль ня будзе сапраўднай зямельнай рэформы.

4-ты пленум Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ

Пленум заслухау даклад загадчыка організацыйным аддзелам ЦК ЛКСМБ тав. П. Галавача „Задачы комсамолу у саветах, у працы сярод беднаты і парабкоу“, які мы друкуем сеньня у скарочаным выглядзе.

Задачы комсамолу, у саветах у працы сярод беднаты і парабкоу

Комсамольская організацыя Беларусі зразумела важнасьць і неабходнасьць штодзённай і сыстэматычнай працы ў гарадзкіх і сельскіх саветая. Аднак яшчэ далёка нездавальняючай зьяўляецца практычны удзел ў саветах мясцовых рганізацый ЛКСМБ. У працу неўцягнуты комсамольцы, беспартыйная рабочая і сялянская моладзь. Праца комсамольцаў-членаў саветаў не правяраецца і на грунце гэтага кіраўніцтва, конкрэтнае кіраўніцтва іх працай адсутнічае. Мы яшчэ не навучыліся зьбіраць вывучаць і распаўсюджваць здабыты вопыт ў адной мясцовасьці на іншыя.

Удзел комсамольцау у Гарсаветах

Выходзячы з важнасьці працы гарадзкіх саветаў, перад комсамолам стаіць задача аддаць найбольшую ўвагу працы ў гарсаветах, дапамозе партыі ў ажыўленьні гарсавету—усямерным разьвіцьцём актыўнасьці, самадзейнасьці і організаванасьці пролетарыяту.

Дзеля гэтага неабходна: рашуча выжываць безадказныя адносіны комсамольцаў абраных у гарсаветы і прымацаваных да іх сэкцый — так званае формальнае сяброўства; у часе выбараў, неабходна вылучаць у гарсаветы тых комсамольцаў, якія могуць і будуць актыўна працаваць у савеце, асабліва тых, якія апраўдалі сябе сваёй працай; дамагчыся нагрузкі комсамольцаў конкрэтнай справай.

Аб кіраўніцтве і разгрузцы

Ячэйкам і камітэтам неабходна наладзіць сталае конкрэтнае кіраўніцтва комсамольцамі-гарсаветчыкамі праз раённыя і гарадзкія нарады, праз пастаноўку іх справаздач на комсамольскіх сходах і г. д. Усім організацыям неабходна практыкаваць прымацаваньне комсамольцаў да сэкцый гарсаветаў узмацніўшы кіраўніцтва іхняй працай.

Але бязумоўна і тое, што калі комсамолец-гарсаветчык пагружаны іншаю працаю, дык карысьці ад яго працы ў гарсавеце нават і пры добрым кіраўніцтве будзе мала. Паўстае пытаньне аб разгрузцы.

Неабходна у далейшым залічаць працу у гарсавеце і яго сэкцыях асноўнай нагрузкай комсамольца абранага у савет, але з другога боку змагацца з момантамі захаваньня пад словам „перагрузка“—нежаданьня працаваць.

Зацікаўленасьць працай у гарсавеце і яго сэкцыях, акуратнае наведваньне пленумаў гарсаветаў і сходаў сэкцый пры умове глыбокага азнаямленьня з працай гарсавету, жыцьцём гораду будзе зарукай разьвіцьцю сярод комсамольцаў гарсаветчыкаў заканадаўчай ініцыятывы у сэнсе пастаноўкі конкрэтных пытаньняў з жыцьця рабочых і гораду. Асабліва важнай трэба лічыць працу комсамольцаў у сэкцыі комунальнай, аховы здароўя коопэратыўна-гандлёвай і сэкцыі працы.

Комсамол у сельсаветах

Грамадзка-політычная дзейнасьць комсамолу у вёсцы павінна будавацца па напрамку усямернай да амогі партыі ў справе ажыўленьня саветаў і умацаваньня саюзу пролетарыяту, батрацтва і вясковай беднаты з асноўнай масай сялянства.

У зьвязку з вялікім узростам ліку абраных у сельсаветы комсамольцаў (з 774 у 1925 г. да 1754 у 1926 г.) і вылучэньнем таварышоў на кіруючую працу у сельсаветах паўстае перад намі задача павышэньня якасьці працы, выжываньня формальных адносін з боку асобных комсамольцаў да працы, павышэньне адказнасьці за выконваемую працу. І тут патрэбна кіраўніцтва, патрэбен кантроль над працай. Асабліва сур'ёзнае кіраўніцтва неабходна над тымі комсамольцамі, якія праводзяць кіраўнічую працу ў сельсаветах, неабходзен уплыў і кіраўніцтва комсамолу беспартыйнай моладзьдзю, якая абрана ў сельсаветы.

Асноўнай формай удзелу комсамолу у працы сельсаветаў павінна стаць актыўная праца у сэкцыях: сельска-гаспадарчай, культурна-асьветнай, гандлёва-коопэрацыйнай, дарожна-будаўнічай і грашова-падатковай. Такі удзел зьяўляецца найпрасьцейшай сувязьзю з гаспадарчым жыцьцём вёскі. І удзельнічаньне не павінна быць на паперы, а ў выкананьні конкрэтнай працы альбо конкрэтных заданьняў.

З боку комсамольцаў-сельсаветчыкаў неабходна ініцыятыва у справе пастаноўкі перад сельсаветам пытаньняў і практычных мерапрыемстваў па гаспадарчаму палепшэньню свайго сельсавету, загадзя абгаварыўшы тое, ці іншае пытаньне ў ячэйцы і склаўшы вакол яго грамадзкую думку сялянства.

Працу комсамолу ў сельсаветах трэба зрабіць штодзённай, унесьці ў яе пляновасьць.

У сувязі з тым, што ў БССР вялікую значнасьць мае праца нацыянальных саветаў, неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу комсамолу на гэтую частку працы, уцягваючы ў працу гэтых сельсаветаў моладзь тых нацыянальнасьцяй, якія абслугоўваюцца сельсаветам.

Комсамол у барацьбе з бюрократызмам і за рэжым эканоміі.

Умацаваньне саюзу пролетарыяту і сялянства ў сучасны момант цесна зьвязана з задачай палепшаньня савецкага апарату, упартай барацьбы з бюрократызмам у ім, за найбольшае патаненьне, за найбольшае ўцягненьне мас працоўнага насельніцтва ў яго працу. Усё гэта павінна стаяць у асяродку ўвагі ўсіх ячэек, камітэтаў ЛКСМБ.

Трэба асабліва ўважлівы падыход ячэек да падрыхтоўкі і вылучэньня комсамольцаў і беспартыйнай (рабочай, батрацкай і сялянскай) моладзі на адказную працу ў гарадзкіх і сельскіх саветах. Патрэбна шырока абгаварваць іх кандыдатуры пры ўдзеле ўсёй масы комсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

Трэба, каб комсамольцы дапамагалі партыі і Рабоча Сялянскай Інспэкцыі ў барацьбе з бюрократызмам, злоўжываньнямі, безгаспадарчасьцю ў савецкім апараце. Трэба весьці з гэтымі зьявішчамі бязьлітасную, барацьбу выкарыстоўваючы наш комсамольскі друк у якім пры дапамозе юнкораў выяўляць безгаспадарчасьць, растраты, нядбайнасьць, безадказныя адносіны служачых да сваіх абавязкаў, нядобрыя адносіны да рабочых і сялянства.

У справе беражлівага вядзеньня гаспадаркі комсамол, асабліва ў асобе комсамольцаў старшынь і сакратароў сельсаветаў і старшынь рэвізійных камісій павінен прыняць самы актыўны ўдзел. Павінна ўзмацніцца кіраўніцтва імі, на гэтыя пасады неабходна вылучаць кандыдатаў з найбольш вытрыманых і аўторытэтных таварышоў.

Комсамол у працы сярод беднаты.

Уся праца комсамолу сярод беднаты адзначаецца цалкам задачамі партыі ў гэтай працы пастаўленымі 14 м партыйным зьездам. Комсамол дапамагае партыі. У комсамоле маецца шэраг дасягненьняў у гэтай сур'ёзнай і важнейшай працы. Аднак гэтая праца яшчэ не дяволі разгорнута. У большасьці праводзім яе толькі ў часе прадвыбарчых кампаній. Назіраецца выпадковасьць і раскіданасьць у справе гаспадарчай дапамогі беднаце.

У зьвязку з гэтым неабходна яснае ўразуменьне масай сяброў ЛКСМБ задач партыі ў гэтай працы. Найбольш распаўсюджанай і праверанай на вопыце формай працы партыі сярод беднаты ў сучасны момант зьяўляюцца сходы беднаты. У гэтай галіне комсамольскім організацыям неабходна: дапамога партыі ў прыцягненьні беднаты на сходы праз пропаганду значнасьці гэтых сходаў, праз апавяшчэньні сіламі комсамолу аб сходах; праз акуратнае наведваньне і ўдзел у працы сходаў комсамольцаў-бядняцкоў; праз большае прыцягненьне на сходы беднаты беспартыйнай бедняцкай і батрацкай моладзі; праз растлумачваньне насельніцтву задач партыі ў працы сярод беднаты, у прыватнасьці на сходах і культднёх сялянскай моладзі, у хатах чытальнях; праз высоўваньне ячэйкамі ЛКСМБ пытаньняў датычных бедняцкай і батрацкай моладзі.

Там дзе пры грамадзкіх організацыях існуюць групы беднаты комсамольцам неабходна прымаць актыўны ўдзел уцягваючы і беспартыйную бедняцкую і батрацкую моладзь, набліжаючы яе да ячэек ЛКСМБ. Праводзячы шырокую працу тлумачэньня аб прадстаўленых беднаце ільготах, комсамольскія організацыі павінны садзейнічаць правядзеньню політыкі партыі на разьвіцьцё гаспадаркі і самадзейнасьці беднаты, вытворчага імкненьня беднаты, бяручы на сябе пачын у справе організацый розных відаў коопэрацыйнага супрацоўніцтва беднаты і серадняков.

Удзел комсамолу ў працы камітэтаў сялянскай узаемадапамогі павінен садзейнічаць правільнаму разьмеркаваньню крэдытаў, ільгот і ўступленьню беднаты ў коопэрацыю

Таксама неабходна забясьпечыць умовы навучаньня бядняцкай і батрацкай моладзі ў школах Сялянскай Моладзі праз павялічэньне ліку стыпэндый, пабудову агульных памяшканьняў.

Комсамол у працы сярод парабкоў.

Комсамол Беларусі ў працы сярод парабкоў мае некаторыя дасягненьні але яшчэ ва ўвесь рост перад ЛКСМБ стаіць задача рашучага правядзеньня ў жыцьцё пастаноў 8-га зьезду ЛКСМБ і 7-га зьезду УсеЛКСМ аб поўным абхопе маладых парабкоў комсамолам, аб вядзеньні выхаваўчай працы сярод іх, працы па ўзьняцьцю політычнай вагі саўхозкай, батрацкай і бедняцкай моладзі ва ўсім жыцьці вёскі, саўхозу, працы экономічнай.


І тут трэба ўвагу зьвярнуць на ўцягненьне ў комсамол дзяўчат-парабчанак і саўхозкіх работніц. Неабходна большае прыцягненьне комсамольцаў парабкоў да актыўнага ўдзелу ў працы ячэек. Неабходна павялічэньне ячэйковага, раённага і кіруючага актыву за лік парабкоў. Неабходна ўзмацніць працу па уцягненьню парабкоў і парабчанак і профсаюзы. Комсамольскім організацыям трэба паставіць перад сабою задачу павялічэньня партасяродку у вёсцы у першую чаргу за лік парабкоў.

Неабходна узмацніць працу комсамольскіх ячэек па абароне інтарэсаў парабкоў праз дапамогу профсаюзу у ахове парабкоў працоўнымі дагаворамі, праверцы іх выкананьня правядзеньнем сходаў парабкоў перад наймам і г. д.

Асаблівую ўвагу комсамолу трэба зьвярнуць на працу па павышэньню агульнай пісьменнасьці і па ліквідацыі непісьменнасьці сярод саўхозкай моладзі і парабкоў—праз уцягненьне ў школы, гурткі, лікпункты.

Гэтак сама у сувязі з беспрацоўем сярод парабкоў асабліва увосень і ўзімку патрабуе зьвярнуць увагу на організацыю рамесьляных школ і майстэрань у вёсцы, дапамогу соцстраху, профсаюзу, камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, праз прыцягненьне беспрацоўных маладых парабкоў па лесараспрацоўкі, працы па мэліорацыі, тарфяныя распрацоўкі.

Вялікі лік сярод парабкоў малалетніх, асабліва эксплёатуемых патрабуе узяць курс на выжываньне наёмнай дзіцячай працы ў вёсцы, адначасова імкнучыся на ўцягненьне іх, а гэтак сама і дзяцей парабкоў, у пачатковыя школы. Правядзеньне гэтага бязумоўна магчыма пры дапамозе аддзелаў народнае асьветы і іншых савецкіх установаў, якія праз матар'яльную дапамогу змогуць утварыць рэальную базу для павышэньня іхняга культурнага ўзроўня і далучэньня іх да комуністычнага дзіцячага руху.



Невялічкі вопыт.

(Ліст з Бабруйску).

З мэтай высьвятленьня становішча культурна-масавай працы і завастрэньню ўвагі організацыі на далейшых задачах у гэтай галіне, мы склікалі гарадзкую конфэрэнцыю па культурна масавай працы.

Хто ўдзельнічаў у конфэрэнцыі?

АПА ячэек, упаўнаважаныя па розным галінам, АПА працы ячэек, бюро юнсэкцый, прадстаўнікі профорганізацый, прад. настаўніцтва ВШРМ усяго чалавек каля 175.

Абвестка дню: 1) Аб становішчы і далейшых задачах масавай працы, 2) даклад Акруговага Савету Фізкультуры, 3) даклад рэдакцыі „Комсамольская Праўда“

Па першаму пытаньню самаму грунтоўнаму, дакладу зусім ня было. Усе прысутнічаючыя вельмі зьдзівіліся, калі дакладчык сказаў, што ён дакладваць ня будзе, а што трэба зразу-ж прыступіць да спрэчак.

Уступная прамова аб грунтоўных момантах пытаньня, заняла 7—8 хвілін і аб'яўлена запісь на спрэчкі.

„Ну ніхто нічога ня скажа“, „хі-хі-хі, без дакладу спрэчкі“ і г. д. было чутно, калі запрасілі выказацца па гэтаму пытаньню. Але-ж вопыт удаўся. Запісалася 35 чалавек выказалася, за недахопам часу 16 чал.—трэба сказаць, што спрэчкі былі вельмі практычныя, неадхіляліся ад тэмы прычым, характэрны тым, што менш гаварылі аб становішчы, а больш аб тым, што трэба зрабіць.

Спрэчкі і прынятая рэзолюцыя зазначае, што для ажыўленьня масавай працы, неабходна комсамольскай ячэйцы бліжэй падыйсьці да гэтай працы, да кіраўніцтва юнсэкцыямі, вызначаць на гэтую працу адпаведных таварышоў. Вырашыць пытаньне аб узаемаадносінах паміж праўленьнямі клюбаў і юнсэкцыямі, а галоўнейшую ўвагу зьвярнуць на зьмест працы. Конфэрэнцыя намеціла шэраг практычных мерапрыемстваў. Астатнія пытаньні таксама прашлі вельмі ажыўлена.

Пішучы гэты артыкулчык мэтай было не пісаць аб рашэньнях конфэрэнцыі (аб гэтым у наступны раз), а падкрэсьліць што вопыт правядзеньня масавай конфэрэнцыі сябе апраўдаў, гэта па-першае, а па другое для большага разьвіцьця самадзейнасьці комсамольцаў і наогул слухачоў менш будаваць 2-х гадзінных дакладаў, а больш вызываць спрэчкі і думкі слухачоў.

Той самы.

Ленінскія унучаты.

Выконваем грамадзкую працу.

(М. Чашнікі, Віцебшчына).

Доўгі час нашы атрады не вялі ніякай практычна грамадзкай працы. З гэтай прычын піонэры ня мелі належнага аўторытэту.

Але з надыходам зімы піонэры ўсхапіліся і вылучылі для працы ў раённую бібліотэку адно зьвяно. Тут яны замяшчалі бібліотэкара, які езьдзіў на дапризыўную падрыхтоўку.

Другое зьвяно працуе ў сельсавеце, піша абвесткі да перавыбараў, і разносіць іх, наогул праца ідзе добра і ёю піонэры вельмі цікавяцца.

Трэцяе зьвяно падало заяву шэфу, каб ён адпусьціў сродкі для пабудоўлі пераплётнай майстэрні.

Толькі такою пастаноўкай працы піонэры заваявалі сабе аўторытэт, як сярод дзяцей, так і сярод дарослага насельніцтва.

Сымон Ішара.

Такое зьявішча зьнішчым.

(г. Пятрыкоў, Мазыршчына),

Усім вядома, што піонэрская організацыя выхоўвае прыкладных дзяцей, а таксама і падрыхтоўвае іх да перадачы ў комсамольскую організацыю. Тые навыкі, якія яны набылі за час прабываньня ў піонэрскай організацыі, павінны захоўваць і ў далейшым. Гэтага нельга сказаць адносна тых піонэраў, якія ўжо зьяўляюцца комсамольцамі Пятрыкоўскай профячэйкі. Іх разам прынялі ў комсамол, пасьля прыняцьця, яны пачалі разам курыць, піць піва есьці семячкі і г. д.

Гэта кампанія, як сустрэнецца з піонэрамі, дык абзывае іх манахамі.

Такія ўчынкі вельмі дрэнна адбіваюцца на малодшых піонэрах.

Бюро комсамольскай ячэйкі такое зьявішча трэба зьнішчыць.

Базыль Мэйлах.

Лепш курам, чым піонэрам.

(М. Зембіно, 31 отрад Ю. П., Барысоўшчыны).

З самых першых дзён пасьля разьбіўкі піонэрскага атраду на два праца пашла як належыць.

Усе піонэры акуратна наведвалі заняткі і зборы атраду.

Праз некаторы час атрад быў падзелены на зьвеньня, якім былі дадзены працоўныя назвы. Каб апраўдаць гэтыя назвы піонэры шчыра ўзяліся за працу.

Зьвяно „Шэвчык“ было далучана да колектыву „Шэйпром“. Тут яны пачалі вучыцца шыць, кроіць і г. д.

Зашоўшы ў піонэрскі клюб, можна ўбачыць у кутку кожнага зьвяна партрэты, лёзунгі і розныя малаткі, шылы, іголкі і г. д. Але вось распаўся колектыў „Шэйпром“ і ў атрадзе пачалі мяняцца назвы зьвеньняў, праца ад гэтага пачала крыху слабець. Праз некаторы час аднялі ў нас клюб і зараз няма дзе праводзіць працы.

У былым нашым клюбе загадчык сямігодкі цяпер запірае сваіх курэй.

Н. В.

Наладзілі сувязь

(вёска Станькава, Койданаўскі раён, Меншчына).

Нядаўна піонэратрад вёскі Станькава наладзіў вечар дзеля таго, каб аб'яднаць дзяцей нашай вёскі з дзяцьмі калёніі „Моладзь Араты“. На гэты вечар былі запрошаны і бацькі вясковых піонэраў.

На вечары гаварылі аб узаемнай сувязі паміж піонэрамі вёскі і калёніі, як яна павінна праводзіцца. Пасьля гутаркі паставілі дзьве п'ескі, а потым наладзілі гульні.

Вечар прашоў вельмі добра. Гэта можна было заўважыць з той зацікаўленасьці, якую праявілі вясковыя дзеці і бацькі піонэраў.

Пасьля такіх вечароў, можна ўпэўнена сказаць, што ўся вясковая дзетвара пойдзе ў піонэратрад.

А. Вінаградаў.

„Калі абяцаеш, дык выконвай“!

(М. Шацк, 1-ы атрад Ю. П.).

Шацкае спажывецкае таварыства ўзяла шэфства над нашым атрадам яшчэ з спачатку організацыі яго ў 1924 годзе. За гэты час шэф купіў нам сьцяг некалькі гальштукоў і некалькі разоў даваў паперу для насьценнай газэты. Але як толькі пераменіўся загадчык коопэратыву, дык зьгінуў і шэф.

Ня гледзячы на пастановы партыйнай ячэйкі і на згоду самога загадчыка аб водпуску 5 руб. кожны месяц і аб выпісцы належнай літаратуры і газэт для атраду, ён і да гэтага часу нічога не атрымаў. У сучасны момант шэф наш нават і паперы для насценнай газэты не дае.

Шацкія.

Пра беларусізацыю—запамяталі.

(М. Чаўсы, Магілеўшчына),

Мне здаецца, што беларусізацыю ў атрадах куды лягчэй праводзіць чым у ячэйках таму, што большая частка піонераў зьяўляюцца вучнямі, а ў школах яны вывучаюць беларускую мову.

У працы нашых атрадаў беларусізацыя павінна заняць адно з галоўных месц.

Нашы павадыры атрадаў яшчэ слаба разумеюць значэньне беларусізацыі. Апрача таго яны ня чытаюць ні беларускай газэты ні літаратуры і ні вучаць беларускай мовы

Запалюць лямпачку Ільліча

Выпусьнікі Віцебскага Электро-Мэханічнага Тэхнікуму, ставшыя тэхнікамі 15 студзеня г. г.

Віцебскі акруговы камітэт ЛКСМБ вітае выпускнікоў Электро-Мэханічнага Тэхнікуму.

Сёньня вы скончылі вучобу і пераходзіце на практычную працу на нашыя фабрыкі і заводы, дзе вам прыдзецца працаваць і кіраваць.

На фабрыках і заводах рабочая моладзь ня мела досыць магчымасьцяў атрымаць належную эдукацыю але да ведаў яна цягнецца і гэта неабходна вам вучытываць у штодзённай працы.

Ваша задача быць ня толькі добрымі тэхнікамі, але і культурнымі, сьвядомымі працаўнікамі.

Акруговы Камітэт спадзяецца, што вы гэткімі і будзеце, служачы добрым прыкладам, апраўдваючы званьне чырвонага спэцыяліста.

Нам патрэбны гэткія спэцыялісты

Савецкая ўлада і Комуністычная партыя надзвычайна уважліва адносіцца да усіх спэцыялістаў, якія працуюць на карысьць соцыялістычнага будаўніцтва. Разам з тым, вядзецца падрыхтоўка новых кадраў спэцыялістых. Зразумела, што падрыхтоўка ідзе паступова. Тым ня менш мы да сёньнешняга дню маем відавочныя дасягненьні. Школьная падрыхтоўка уласных спэцыялістых у нас наладжана, і цэлы шэраг навучальных установаў Савецкага Саюзу пачынае даваць выпускі такіх спэцыялістых, якіх мы жадалі, якія нам патрэбны. Неабходна толькі практыка і магчыма больш шырокая і больш поўная.

Кожная спэцыяльнасьць патрабуе для свайго удасканаленьня практычных навыкаў, але асабліва гэтага патрабуе прамыслова-заводзкая галіна. Каб організаваць і кантраляваць працу злучэньня машыны і чалавека неабходны сталыя веды абодзьвух гэтых элемэнтаў у тэорыі і практыцы. Мэтодыка лічыць найлепшым для уяўленьня і посьпеху чарадаваньне удзелу у працоўных процэсах са школьнымі заняткамі.

Комплектаваньне нашых навучальных установаў, у асаблівасьці тэхнікумаў, рабочымі, павінна даць з гэтага мэтодычнага пункту погляду надзвычайна добрыя вынікі. Патрэбен толькі некаторы час.

Зараз мы ўжо пачынаем атрымоўваць рабочыя выпускі у нас, на Беларусі.

Віцебскі Электро-Мэханічны тэхнікум 15 студзеня г. г. зрабіў выпуск спэцыялістаў з характэрным, у гэтым напрамку, тварам: 41 проц. рабочых ад варстата, 14 проц. дзяцей рабочых, рэшта-дзеці сялян і служачых.

Нам патрэбны гэткія спэцыялісты.

Дырэктар Тэхнікуму Інжынэр ШМАНЦАР.

Менск—Цэнтральнаму Камітэту ЛКСМБ

Сьвяткуючы свой выпуск, выпускнікі віцебскага электро-мэханічнага тэхнікуму шлюць палкае прывітаньне Цэнтральнаму Камітэту ЛКСМБ.

Хто яны.

У 1921—1922 г. пачалося мірнае будаўніцтва. З усіх куткоў Беларусі, з вёсак, фабрык, заводаў, прыехалі яны ў горад за ведамі.

Веды дзеля паступленьня ў тэхнікум патрэбны былі самыя мізэрныя—магчы пісаць і чытаць. Некаторыя з іх не жадаючы пакідаць сваіх варстатаў, адначасова і вучыліся і працавалі. Некаторыя ня вытрымалі ўсіх цяжкасьцяў па шляху аўладаньня навукай і ў першыя гады навучаньня пакінулі тэхнікум.

Соцыяльны склад выпускнікоў не параўнаўчы з папярэднімі выпускамі. Сярод выпускнікоў мы маем частку партыйцаў, якія ў часе вучобы несьлі ўвесь цяжар грамадзкя-профэсыянальнай працы, накіроўваючы ўсё жыцьцё тэхнікуму.

Мы можам запэўніць, што ў іх асобе Савецкая Беларусь мае надзейных будаўнікоў соцыялістычнай гаспадаркі.

Айзман.

Мы аддаем ясную справаздачу.

Шмат з нас, выпускнікоў, прышлі сюды з фабрык і заводаў, некаторыя маюць з сабою 5—8 гадовы рабочы стаж, і мы гэтак нядаўна мала пісьменныя рабочыя ідзём сёньня кіраваць прамысловасьцю, будаваць соцыялістычную гаспадарку.

Мы ў тэхнікуме атрымалі ня толькі тэхнічную падрыхтоўку, але і політычнае выхаваньне і грамадзкія навыкі.

Пакідаючы тэхнікум мы аддаем сабе ясную справаздачу аб тых цяжкасьцях, якія нам сустрэнуцца на шляху перапрацоўцы атрыманых тэхнічных ведаў у практычнае жыцьцё. Навука увес час ідзе наперад, і нам прыдзецца па практычнай працы павялічываць свае тэорытычныя веды.

Мы упэўнены, што на шляху сваёй практычнай дзейнасьці пераможам усе цяжкасьці, як мы іх перамагалі на шляху аўладаньня тэорыяй.


Мурміс.

І спэцы і грамадзкія працаўнікі

Выпушчаецца 58 чалавек, з якіх 22 комсамольцы. Для нас 22—акрамя акадэмічных посьпехаў маецца яшчэ адзін ня менш важны посьпех. Вучачыся ўсе мы былі прасякнуты думкаю і сьвядомасьцю, што акрамя тэхніка-спэцыялістага павінен з нас вытартоўвацца і тэхнік грамадзкі працаўнік. Ня мала над гэтым працавалі нашыя партыйная, комсамольская і профсаюзная організацыі.

Паступаючы ў тэхнікум ня ўсе 22 былі комсамольцамі, а хто і быў комсамольцам, дык „шэранькім“. Пра актыўную працу, пра ўступленьне у шэрагі ленінскай партыі, ніхто і не разважаў, адчуваючы сябе непадрыхтаваным. А цяпер з 22 х мы маем 9 членаў і кандыдатаў партыі, а ў адносінах політасьветы усе як адзін з першай катэгорыі пераступілі ў партыйную сетку.

Глускін.



Бедната выбірае комсамольцау і комуністау

Перавыбары сельсаветау па акругах Беларусі—у поуным разгары!

Актыўна працуючы у сельсавеце, комсамольцы сельсаветчыкі на справе даказваюць сваю адданасьць соцыялістычнаму будаўніцтву.

Больш конкрэтнай працы!

(Астрашыцка-Гарадзецкі раён, Менскай акругі).

Усяго комсамольцаў, выбраных у сельсаветы ў 1926 годзе было 22 чал. Справаздачная кампанія гэтага году выявіла, што большасьць комсамольцаў сельсаветчыкаў на працы сябе апраўдала.

Член сельсавету Панічаўскага вучастку Астрашыцкага сельсавету тав. Цішэвіч сваёй ініцыятывай прыцягнуў грамадзкую думку да пабудаваньня мосту праведзена 9 розных ацэнак маемасьці, паміры́ў 12 свярак, сам правёў каля 10 вучастковых сходаў па розным пытаньням, па яго вучастку падатак паступае сваечасова. Справаздачны вучастковы сход прызнаў яго працу добрай. Сход беднаты ня гледзячы на самы катэгорычны яго адказ—зноў аднагалосна рэкомэндуе ў новы сельсавет кажучы: „Ен хоць і малады, але зухаваты працаўнік“.

Далей, член Беларуцкага вучастку Вардамскі Аніс таксама ўпартай працай зарабіў сабе аўторытэт ад сялянства і аднагалосна абран у склад новага сельсавету. Есьць яшчэ шэраг таварышоў, якія сваёй працай прынесьлі вялікую карысьць насельніцтву сельсавету.

Есьць тры сельсаветчыкі, якія карыстаюцца добрай пашанай сярод сялянства і могуць працаваць, але праца прызнана слабай. Гэта з прычыны таго, што яны на доўгі час пакідалі дом і ішлі на заработкі. Апошні год з комсамольцаў-сельсаветчыкаў, у агульным, выкаваў добрых грамадзкіх працаўнікоў.

Той-жа самы Цішэвіч кажа: — «Як мяне абралі ў сельсавет дык аж страшна стала,—як гэта зрабіць падзел, абмерыць зямлю, напісаць справу, а цяпер усё гэта для мяне—глупства».

Другі член сельсавету дадае:—„Цяпер я буду разумнейшым. Працаваў цэлы год, шмат чаго зрабіў, а як прышлося рабіць справаздачу дык і ня прыпомніць, што зроблена. У далейшым буду запісваць праробленае“.

Некаторыя комсамольцы - сельсаветчыкі гаварылі, што там, дзе комсамольцаў 5-6 у сельсавеце трэба праводзіць сельсавецкія нарады.

Я. Позьняк.

Сумесна з партыйцамі.

(Станькаўскі с.-с., Койданаўскі раён).

Ва ўсёй прадвыбарнай кампаніі Станькаўская партячэйка і комсамольская ячэйка праводзілі сходы беднаты, дзе ўсебакова абгаварвалі склад новага сельсавету, вызначалі новыя кандыдатур.

З мэтай абраньня працаздольнага сельсавету, партыйная ячэйка прапанавала комсамольскім ячэйкам прымацаваць сваіх больш моцных таварышоў да выбарчых пунктаў, дзе яны-б праводзілі належную прадвыбарчую працу.

Комсамольскія ячэйкі гэту прапанову выканалі і чакаюць дня выбараў.

Латушка.

БЕДНАТА—ЗА КОМСАМОЛЬЦАЎ.

(Слабадзкая ячэйка ЛКСМБ, Горацкі раён, Аршаншчына).

У 1924 годзе Слабадзкая моладзь правяла ў сельсавет аднаго комсамольца. Пажылыя сяляне адносіліся да гэтага з ўсьмешкай: — „Не яму працаваць у сельсавеце!“.

У наступным годзе правялі ўжо двух комсамольцаў. Першага выбралі старшынёй сельсавету.

Зараз адзін комсамолец нашай ячэйкі—старшыня сельсавету, другі—яго намесьнік.

У камітэце сялянскай узаемадапамогі працуюць 2 комсамольцы і адна дзяўчына комсамолка. На выбары комсамолкі некаторыя глядзелі „скрозь пальцы“, а цяпер—хто ня чуў у нас пра дзяўчыну Новікаву?

У новы сельсавет таксама аднагалосна прашло некалькіх комсамольцаў.

Па ініцыятыве комсамольцаў-сельсаветчыкаў ранейшага складу ячэйка сумесна з моладзьдзю пабудавала 2 масты (адзін з іх каштуе 800 р.), абсталявала пажарныя абозы пры двух пажарных дружынах і інш.

Цяпер бедната глядзіць на комсамольцаў, як на сумленных працаўнікоў, як на абаронцаў сваіх інтарэсаў

ТОДАР.

7 комсамольцаў у сельсавеце

У прэзыдыум выбраны адны комсамольцы

(Жыліхоўскі с. с., Чырвона-Слабадзкога раёну, Слуцкай акругі).

Падводзячы падрахунак праведзенай намі выбарчай кампаніі па Жыліхаўскім сельсавеце ў гэтым годзе—можна застанавіцца на шмат якіх цікавых момантах.

Наперш, гэта актыўнае выступленьне на сходах выбіральнікаў моладзі і моцная згуртаванасьць беднаты з батрацтвам у справе абароны сваіх інтарэсаў.

Комсамольскія ячэйкі пашыраюць комуністычны ўплыў на насельніцтва. На сходах ячэйкі высоўвалі свае сьпісы кандыдатур у сельсавет і на 80 проц. высунутыя таварышы праходзілі.

Трэба заўважыць яшчэ таксама і тое, што на сёлетніх выбарах дзядзькі аднагалосна праводзілі комсамольцаў і ў шмат якіх мясцох самі высоўвалі хлопцаў з „комсамолістай сям'і“.

Гэта гаворыць за тое, што комсамольцы на грамадзкай працы сябе апраўдалі.

У мінулым годзе ў складзе нашага сельсавету было толькі 3 комсамольцы.

У гэтым годзе мы маем ўжо абранымі 7 комсамольцаў, што складае 50 проц. усяго складу сельсавету.

У мінулым годзе ў нас старшынёю і сакратаром сельсаветаў працавалі комсамольцы.

Зараз у нас увесь прэзыдыум складаецца з комсамольцаў (старшыней і сакратаром засталіся леташнія таварышы.

Наогул у гэтым годзе соцыяльны склад сельсавету палепшыўся, у яго не папаў ні адзін кулак.

Гэта тлумачыцца сваечасовым праведзеньнем прадвыбарчай кампаніі.

У рэвізійную камісію прайшоў зноў адзін комсамолец. Страхавымі ўпаўнаважанымі зьяўляюцца 2 комсамольцы. На раённы зьезд саветаў выбраны 2 комсамольцы і адзін партыец. Комсамольцы на выбарах былі вельмі актыўнымі і задачы высунутыя Цэнтральным Камітэтам энэргічна праводзіліся ў жыцьцё.

М. Шпілеўскі.

За політыку міра і за моцную пролетарскую абарону Савецкіх Рэспублік.

(З дакладу т. Бухарына на 15-й Маскоўскай губпарткон фэрэнцыі).

Нам трэба сьмела і адкрыта весьці тую політыку, якую мы вялі і да гэтага часу політыку міра.

Сваё імкненьне да міру мы даказалі тым, што заключылі з некаторымі дзяржавамі дагаворы аб узаемным ненападзе; гэта таксама мы выразна даказалі нашай мірнай позыцыяй у часе непаразуменьня з Чжан-Цзо-Лінам на кітайска ўсходняй чыгунцы. Мы можам адкрыта заявіць, што калі-б хацелі, дык ураз маглі-б скрышыць Чжан-Цзо Ліна які адважыўся на гэткую брыдкую авантуру супроць краіны саветаў. Мы гэтага не захацелі, мы гэтага не зрабілі, хоць і цяжка было ўстрымацца ад гэтага. У даным выпадку мы яшчэ і яшчэ раз даказалі сваімі паводзінамі, што вядзём і будзем весьці політыку міра.

Зразумела, што сваёй політыкай міра мы зусім ня ўнікаем, а, наадварот,—імкнемся да ўсякага вызваленчага руху. Мы яшчэ і яшчэ раз паўтараем, што заўсёды былі і будзем абаронцамі прыгнечаных усяго сьвету

Усе памятаюць, што ў найбольш рашучыя моманты грамадзянскае вайны і нападу на нас мы змагаліся большаю часткаю адны. Праўда, і тады нас падтрымліваў заходня-эўропэйскі пролетарыят, у некаторых дзяржавах пачыналася нават рэволюцыя, але яна спынялася на паўдарозе. Зараз ня гледзячы на частковае ўзмацненьне некаторых буйнейшых заходня-эўропэйскіх краін як Амэрыкі, мы бачым два вялікіх гістарычных факты: першы—гэта пераход да ўзмацнёнага будаўніцтва Савецкай Рэспублікі, да так званага пэрыоду перабудаваньня, калі мы закладаем асновы новае тэхнікі; гэты факт адыгрывае вялізную ролю ў справе ўзмацненьня сусьветнае пролетарскае барацьбы. Гэты новы пэрыод разьвіцьця нашае рэволюцыі супадае з вялікай сусьветна-гістарычнай падзеяй—вялікай кітайскай рэволюцыяй, аб якой кожны з нас чытае ў газэтах і пільна сочыць за тым, як з кожным днём, з кожным месяцам узмацняецца яе размах. Ангельскія імпэрыялістыя пасылалі ў Кітай браняносцы пасылалі туды сваіх матросаў, накіравалі ўзброеную сілу, прабавалі лісьлівасьцю ўзяць кантонскі ўрад. Але цяпер і ўся Эўропа і ўвесь сьвет бачаць, як кітайскія народныя масы тоняць ангельскіх імпэрыялістых з Кітаю і нават з іх концэсій, як кітайскія рабочыя робяць расправу з бандамі імпэрыялістычных захопнікаў, якія імкнуцца задушыць кітайскую рэволюцыю; мы пэўны, мы цьвёрда спадзёмся на тое, што 400 мільённая народная маса Кітаю ўрэшце такі зьмяце са свайго шляху ўсё старое, усё захопніцкае, усё імпэрыялістычнае.

Такім чынам, барацьба рэволюцыйных сіл з сіламі капіталістых яшчэ больш узмацнілася.

І вось пры гэткіх абставінах мы зноў павінны паставіць перад сабою пытаньне: ці магчыма зараз вайна або напад на нас? На гэта пытаньне мы адказваем: вайну рыхтуюць. Мы ня ведаем, ці будзе вайна ў бліжэйшы час, ці не, але мы напэўна ведаем, што яе рыхтуюць. Як супрацьвагу гэтай падрыхтоўцы вайны, мы будзем перш за ўсе пашыраць нашу п р о п а г а н д у за мір. Мы добра ведаем, што магчымая вялікая барацьба паміж намі і капіталістычнымі краінамі ў выніку будзе вырашацца ня столькі сіламі вайсковае тэхнікі, колькі настроямі шырокіх народных мас. Гэтыя настроі вырашаць усю справу. Але гэта зусім не азначае што мы павінны нядбайна адносіцца да пытаньняў вайсковае тэхнікі. Мы павінны з вялікай увагай аднесьціся да пытаньняў узмацненьня нашай абароназдольнасьці.

Уся наша політыка, кожны наш дыплёматычны крок павінны быць прасякнуты імкненьнем да міру.

Але мы можам запэўніць усіх нашых ворагаў, што за час доўгай перадышкі, якую мы мелі, за час нашага гаспадарчага будаўніцтва мы не аслабілі баявой здольнасьці комуністычнага пролетарыяту. На кожную небясьпеку, што будзе пагражаць пролетарскай дыктатуры, рабочая кляса нашай краіны і яе комуністычная партыя адкажуць нябывалым згуртаваньнем сваіх шэрагаў. Гэтыя шэрагі згуртуюцца так, што любы наш супраціўнік зможа абламаць зубы аб сталёвую сьцяну нашых штыхоў.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

Аб уступіцельным і сяброўскім узносе.

Цэнтральным Камітэтам УсеЛКСМБ распрацована новае палажэньне аб уступіцельных і сяброўскіх узносах. Устанаўліваецца ўступіцельны ўзнос ў разьмеры 2 проц. месячнага заробку. Вучні і беспрацоўныя плоцяць уступіцельны ўзнос у разьмеры 15 капеек. Сяброўскія узносы ўстанаўліваюцца ў наступным разьмеры: для працуючых якія атрымліваюць у месяц да 50 рублёў—½ проц., звыш 50 рублёў—1 проц. месячнага заробку.

Для вучняў, і тых якія займаюцца хатняй гаспадаркай, сельскай гаспадаркай, а таксама асоб з невызначанай заробчай платай разьмер сяброускага ўзносу ўстанаўляецца мясцовым комітэтам ЛКСМ. Асобы, якія ня плоцяць сельска-гаспадарчага падатку—плоцяць 5 кап., а якія плоцяць сельска-гаспадарчы падатак—плоцяць 10 кап.

Сябры УсеКП(б), якія адначасова лічацца кандыдатамі і сябрамі Усе ЛКСМ—плацяць сяброўскі ўзнос толькі ў партыю.

Да нарады экономпрацаўнікоў.

У працы усебеларускай нарады экономпрацаўнікоў ЛКСМБ якая адбудзецца 20 студзеня г. г., прымуць удзел экономпрацаўнікі акругкомаў прадстаўнікі Комсамолу ў ЦІІ саюзаў і фабзаўмясцкомы буйных прадпрыемстваў Беларусі. Усяго каля 18 чалавек.

У парадку дню стаяць пытаньні: 1) Вынікі ўсесаюзнай нарады экономпрацаўнікоў, 2) Аб броні і зьверхброні вучнёўства, 3) Меры барацьбы з беспрацоуем і ўнядрэньне моладзі ў саматужную прамысловасьць, 4) Аб масавай экономпрацы, 5) Экономпраца ў вёсцы, 6) Аздараўленьне рабочай моладзі.

Менская акруговая конфэрэнцыя ЛКСМБ.

Менская акруговая конфэрэнцыя Комсамолу склікаецца 5-га лютага з наступнай абвесткай дню:

— Даклад ЦК ЛКСМБ (Бараньнікаў).

— Справаздача АК ЛКСМБ (Шаліма).

— Садаклад Аркбюро Ю. П. (Ільлін).

— Аб працы сярод рабочай моладзі (Рубін).

— Выбары акруговага камітэту і рэвізійнай камісіі.

Бюро Менскага АК ЛКСМБ пастанавіла запрасіць на акруговую конфэрэнцыю прадстаўніка лінкору „Парыская Комуна“.

Агляд комсамольскіх політшкол

З 15-га студзеня па 15 лютага г.г. Цэнтральным Камітэтам УсеЛКСМ разам з рэдакцыяй „Комсамольскай Праўды“ організуецца ўсесаюзны агляд працы комсамольскіх гарадзкіх політшкол. У аглядзе ўдзельнічаюць усе гарадзкія політшколы першай і другой ступені і вопытныя політшколы. Лепшым школам, якія выявяць сябе на аглядзе, будуць выданы 3 прэміі: 1-я прэмія—бібліотэка, якая каштуе 75 руб. і „Комсамольская Правда“ на ўвесь навуковы год.

2-я прэмія—бібліотэка, каштоўнасьцю—у 50 руб. і „Комсамольская Правда“ на ўвесь навуковы год.

3-я прэмія—біоліотэчка каштоўнасьцю—у 25 руб. і „Комсомольская Правда“ на ўвесь навуковы год.

Акрамя таго, устанаўляецца прэмія на лепшую корэспондэнцыю аб політшколе—поўны збор твораў У. І. Леніна.

Што рыхтуюць піонэры.

Райбюро ЮП Ляхаўскага раёну ЛКСМБ рыхтуе да 22 студзеня масавую гульню, якая зьявіцца яскравым адбіткам падзеяў 1905 году.

Гульня будзе праведзена сіламі усіх піонэраў Ляхаўскага раёну. Прымуць удзел у гульні 26 атрадаў.

Піонэры раздабылі старыя праклямацыі РСДРП, якія разьвесяць у дзень сьвята па ўсім вуліцам гораду Менску.

Дапамога справай

ЦК Помдзет адпусьціў 2.000 руб. на ўтрыманьне 2-х калёній для беспрытульных у Магілёве.

* * *

Бабруйскі акруговы аддзел Помдзет адпусьціў 5.000 руб. на палепшаньне становішча мясцовага дзіцячага дому.

Перарасткі на прадпрыемствах будуць разбраніраваны.

Аб чым кажа дырэктыва ВСНГ і ЦСПСБ?

У шмат якіх установах і прадпрыемствах БССР працуюць перарасткі (звыш 18 гадоў). Гэтыя перарасткі лічацца ў броні і такім чынам тармазяць ліквідацыю беспрацоўя сярод падросткаў. Па некаторых саюзах лік такіх перарасткаў дасягае 40 процантаў.

Улічваючы гэта становішча, ЦСПСБ, ВСНГ і Наркампрацы выдалі спэцыяльную дырэктыву, якая прапануе адміністрацыям прадпрыемстваў на мясцох, пры ўдзеле профэсыйных і комсамольскіх організацыяў і органаў Наркампрацы—правесьці ў бліжэйшы час наступнае: праверыць колькасьць падросткаў і перарасткаў, якія знаходзяцца ў парадку броні на прадпрыемствах і вызначыць конкрэтныя мерапрыемствы па разбраніраваньню перарасткаў,

У першую чаргу павінны быць разбраніраваны перарасткі, маючыя вызначаную кваліфікацыю ня ніжэй 4-га разраду.

Пры праведзеньні працы па разбраніраваньню не павінна мець месца скарачэньні перарасткаў. Апошнія павінны пераводзіцца ў асноўны штат рабочых і служачых данага прадпрыемства, адпаведна сваё кваліфікацыі.

Скліканая на днях нарада Менскага комсамольскага экономактыву падрабязгова абмеркавала гэтую дырэктыву і вызначыла ролю комсамольскіх ячэек у справе разбраніраваньня перарасткаў.

З—р.

Запытаньні і адказы

ЗАПЫТАНЬНЕ № 768 (З) Ці прымуць хлапца, які нарадзіўся у 1905 годзе, у тэхнікум, калі ён па некаторым прычынам не падлягае да вайсковай службы?

АДКАЗ. У тэхнікумы наогул прымаюць толькі да 20 год.

ЗАПЫТАНЬНЕ. № 769 (З.) Ці можна паступіць на рабфак скончыўшым профшколу?

АДКАЗ. Гэтае пытаньне пакуль што яшчэ не вырашана. У хуткім часе будзе выкана гэтага сьведамляна пастанова Галоўпрофасьветы.

ЗАПЫТАНЬНЕ. № 770 (Кастрамцы). Ці можна з тэхнікуму БССР пераведзіцца у тэхнікумы РСФСР?

АДКАЗ. Можна.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 771 (С) Калі я не задаволен пастановай стыпэндыяльнай камісіі, то куды патрэбна зварачыцца?

АДКАЗ. У пэдагагічны савет той навучальнай установы, у якой ты вучышся.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 772 (С.) Ці можна зьмяніць пэдсавет тэхнікуму пастанову стыпэндыяльнай камісіі?

АДКАЗ. Можа. Бо ён зацьвярджае усе пратаколы і пастановы стыпэндыяльнай камісіі.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 773 (С.) Чаму гэта Галоўпрофасьветы дае стыпэндыі некаторым таварышам, якім стыпэндыяльная камісія у гэтым адмоўлала?

АДКАЗ. У некаторых выключных выпадках Галоўпрофасьветы робіць пастановы аб дачы тым ці іншым таварышам стыпэндыю, бо стыпэндыяльная камісія і педагагічны савет могуць іншы раз памыліцца. Але гэта бывае вельмі рэдка.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 774. (С. Л.) Ці можа паступіць у тэхнікум скончыўшы савпартшколу?

АДКАЗ. Можа.

Фізкультура.

У Гомлі і Рэчыцы аформлены акруговыя саветы фізкультуры.

На усесаюзную нараду ФЗК (Масква) камандыруюцца 2 прадстаўнікі ВСФКБ—т. т. Цэйтлін і Леў.

У пачатку лютага м-ца ў Менску адбудуцца спаборніцтвы па лыжнаму спорту на першынство БССР.

ВСФКБ праводзіць дасьледаваньне фізкультурнай працы ў Віцебску.

У пачатку лютага адбудзецца экскурсія на лыжах па маршруту Менск—Масква.

На 5 школ больш

У прылучанай да БССР Гомельшчыне маюцца наступныя навуковыя ўстановы: тэхнікум шляховых зносін —169 чал., белар. пэдтэхнікум—150 чал., яўрэйскі пэдтэхнікум —120 чал. і б. партшкола—215 чал.

У Рэчыцкай акрузе маецца лясны тэхнікум—97 чал.

За 30 капеек.

Вячэры у комсамольскай сталоўцы.

Апрача адпушчаемых цяпер танных абедаў у Менскай комсамольскай сталоўцы з 1-га лютага пачнецца адпуск вячэраў.

Моладзь будзем мець магчымасьць атрымоўваць за 30 кап. добрую вячэру.

К.

Беларускія зямляцтвы.

Усесаюзная конфэрэнцыя пролетарскага студэнцтва даручыла ЦБ Пролетстуда БССР распрацаваць статут для беларускіх зямляцтваў ў нацыянальных рэспубліках.

Гэты статут неабходна правесьці ў жыцьцё праз 3 месяцы.

Беспрытульнасьць і детдомы

Нядаўна спэцыяльная камісія з удзелам прадстаўнікоў Гарсавету, ЦСПСБ і іншых зацікаўленых установаў правяла досьлед менскіх дзіцячых дамоў.

Вынікі гэтага досьледу ужо часткова асьвятляліся у «Чырвонай Зьмене». Ужо пісалі, што у Дзіцячым гарадку імя Чарвякова і прыемніку для беспрытульных існуюць дрэнныя санітарныя умовы, не хапае адзеньня, абутку і інш.

У сучасны момант прымаюцца меры дзеля палепшэньня становішча выхаванцаў дзетгарадку і прыемніку. Саўнаркам БССР пастанавіў асыгнаваць 5.000 руб. дзеля гэтай мэты.

У астатніх дзіцячых установах (піонердом, вучэбна-вытворчыя майстэрні, сельска-гаспадарчыя дзеткалёніі па акрузе)—санітарныя і матэр'яльныя умовы больш менш задавальняючыя.

У большасьці дзетдамоў існуюць майстэрні: пераплетныя, сталярныя, краўецкія і г. д. Некаторыя з іх, акрамя самаабслугоўваньня, працуюць яшчэ і па заказам. Трэба адзначыць, што майстэрні недастатковы абсталяваны.

Агульны лік выхаванцаў у дзетдамах Менскай акругі дасягае 673, прычым лік гэты павялічваецца за кошт беспрытульных.

У апошні час дзетдамы вызваляюцца ад перарасткаў (каля 16-17 гадоў) шляхам накіраваньня апошніх на прадпрыемствы у парадку броні. За апошні час атрымалі працу 15 перарасткаў.

Перапіс Менскага насельніцтва выявіў наяўнасьць у горадзе 45 беспрытульных. Акрамя гэтага маецца каля 150 дзяцей, якія жывуць у прыватных домах, але знаходзяцца у вельмі дрэнным становішчы і патрабуюць дапамогі.

Якія-ж перспэктывы ліквідацыі беспрытульнасьці па Менскай акрузе? У гэтым годзе вызначана організацыя двух сельска-гаспадарчых дзіцячых калёній, якімі можна будзе ахапіць усіх беспрытульных і дзяцей што знаходзяцца у вельмі дрэнных умовах.

З.

За вывучэньне свае акругі

Віцебшчына

Краязнаўчая праца па Віцебшчыне вядзецца ўжо некалькі год, але комсамольская маса аб ёй мала чаго ведае.

Вынікам вышэйадзначанага і зьяўляецца слабы ўдзел у працы таварыства і малая колькасьць комсамольцаў—яго сяброў.

Усяго па акрузе мы ледзь-ледзь налічым сто комсамольцаў, сяброў краязнаўчых гурткоў, прычым амаль што ўсе яны падаюць на вёску.

У горадзе-ж у працы сэкцый Акруговага Праўленьня Таварыства прымаюць удзел усяго-на-ўсяго, здаецца, тры комсамольцы і два піонэры.

Адным словам вынікі вельмі сумныя.

Організацыі за краязнаўчую працу неабходна ўзяцца.

Аб гэтым кажуць пастановы ЦК і Акругкамолу.

З краязнаўчай працай неабходна азнаёміць шырокія масы саюзу.

Неабходна павесьці працу па ўцягваньню комсамольцаў у сябры таварыства, у першую чаргу ўзяўшы курс на вучняў розных навучальных устаноў.

Асноўнымі момантамі працы на бліжэйшы час павінны быць: гэдзейнічае зьбіраньню слоў жывой мовы Віцебшчыны, азнаямлен не з помнікамі старажытнасьці і популярызацыя краязнаўчай працы сярод беспартыйнай моладзі.

М. Таптыгін.

Суд

„Кампаніёны“

Іван Іванавіч прапанаваў вясковай дзяўчыне Ганне Бачкаровой „свае сэрца, сваю руку“... Адным словам прапанаў ёй сваё каханьне і затым жаніцьбу.

Ганна, аднак, ведала, што Іван заможны хлапец, і таму ня верыла ў тое, што ён на ёй—беднай дзяўчынцы—можа жаніцца.

— «Ня я буду, калі я яе не вазьму»!—так парашыў Яцкоў.

Не аклядваючы справу ў доўгую скрынку, Яцкоў рашыў дагаварыцца аб гэтым з сваім прыяцелем і крэўным Ганны—Мацьвеем Бачкаровым.

22-га ліпня 1926 году быў прыгожы сьвяточны дзень. І Ганна з дзяўчатамі, карыстаючыся гэтым пашла па ягады.

У лесе дзяўчаты спаткалі Мацьвея Бачкарова. Ён пажадаў ім посьпеху ў зборы ягад, а сам схаваўся. Аднак, праз кароткі час Мацьвей ізноў зьявіўся. Ён падышоў да Ганны, і ўзяўшы яе пад руку, стаў адвадзіць ад дзяўчат і ў кустах яе згвалціў, а потым да іх падышоў і Мацьвей.

Магілёўскі акруговы суд прыгаварыў Яцкова Івана і Мацьвея Бачкарова да 3 год турэмнага заняволеньня—кожнага.

Вышэйшы суд БССР прыгавар пакінуў у моцы.

Він.

Як могуць „доіць“...

(Ад нашага Віцебскага кор-та).

Многа сярод нас такіх, якія на Страхкасу глядзяць выключна, як на «дойную карову». „Такіх“ зусім ня трывожыць тое, што Страхкаса ледзьледзь зводзіць канцы з канцамі, каб толькі здаволіць запатрабаваньні хворых, беспрацоўных, інвалідаў і г. д. Іх справа маленькая: цягні ад страхкасы, што можаш, як далей—«наша хата з краю»...

Вось такімі былі і рабочыя Бэйлінсон і Шчарбакоў. Яны каля 5 6 месяцаў працавалі на прадпрыемстве і ў тоў жа час, як «беспрацоўныя»... атрымлівалі грошы з Страхкасы.

Жонка грамадзяніна Уладзімеровіча перадала сваю страхавую кніжку знаёмай — не сябру саюзу і тая радзіла ў дзяржаўнай больніцы дзіцяне. І пасьля гэтага Уладзімеровіч стаў атрымліваць на працягу 9 месяцаў ад Страхкасы грошы на „кармленьне дзіцяці“. Калі-ж гэтыя 9 месяцаў скончыліся, Уладзімеровіч падаў запіску аб сьмерці дзіцяці і... зноў атрымаў «на пахаваньне».

Усе гэта каштавала Страхкасе г. Віцебску каля 80 руб.

Судзілі Бэйлінсона, Шчарбакова і Уладзімеровіча разам.

Першыя два атрымалі адзін год зьняволеньня ўмоўна. Апошняга прыгаварылі да 1 году і 3 месяцаў турэмнага заняволеньня.

Акрамя гэтага суд ухваліў паставіць пытаньне перад профсаюзам аб прабываньня ў яго шэрагах Бэйлінсона, Шчарбакова і Уладзімеровіча.

Мік. Т.

На кніжнай паліцы.

Аб кніжцы „Рабочая молодежь Белоруссии“

(Напісана на падставе матар'ялаў мэдагляду рабочай моладзі БССР 1925 году).

Упяршыню аб моладзі Беларусі ў сэнсе яе колькасьці, быту, умоў працы і становішча здароўя напісана такая вялікая (10 аркушаў) і сур'ёзная праца.

У Беларусі мэдаглядам ахопліваецца больш шырокая кола пытаньняў якія датыкаюцца быту, кватэрных умоў, харчаваньня, рабочага дню моладзі і г. д., чым ся ў іншых саюзных рэспубліках. Таму такое вялікае значэньне набывае вышаўшая нядаўна з друку кніжка „Рабочая молодеж Белоруссии“. Кніжка гэта напісана на падставе матар'ялаў мэдагляду 1925 году, пры чым матар'ялы гэтыя выкарыстаны ў поўнай меры.

Кніжка дае яснае ўяўленьне аб быту рабочай моладзі ў нашай рэспубліцы. Яна адбівае ўсе агаблівасьці беларускіх умоў, з якімі мы сустракаемся ў практычнай працы.

Кніжка разьбіта на 5 самастойных аддзелаў, якія, аднак, органічна зьвязаны паміж сабою і выцякаюць адзін з другога: „Колькасьць і склад рабочай моладзі ў Беларусі ў 1925 годзе“—(Эйнгорн); Кватэрныя ўмовы і харчаваньне падросткаў“—(Смулевіч); „Стаж і заробчая плата“—(Смулевіч); «Рабочы час падросткаў»—(Дзіхцяр) і «Фізічны стан рабочых падросткаў»—(Дзіхцяр). Аўтары гэтых аддзелаў працаўнікі Наркамахова Здароўя, якія прымалі непасрэдны ўдзел у організацыі і правядзеньні мэдагляду.

На жаль, кніжка вышла ў невялікім тыражу (1000 экз.) і ня зможа задаволіць увесь спрос. Каштоўнасьць гэтай кніжкі для кожнага экономпрацаўніка—бясcумленна. «Рабочая молодежь Белоруссии» зьявіцца добрым падручнікам у практычнай экономпрацы нашага саюзу.

Кніжка гэта таксама багаты ўклад у навуковую літаратуру.

Недахопам кніжкі па нашаму найбольш важным і амаль адзіным зьяўляецца тое, што яна мала мае «мяса»... Зразу кідаецца ў вочы вялікі лік розных табліц, да якіх няма належных комэнтарыяў. Таксама тэкст кніжкі вельмі лаканічны, кароткі і не дае вызначаных конкрэтных вынікаў.

Вось, што кажа, аб кніжцы прадмова да яе экономкамісіі ЦК ЛКСМБ: «З гэтай працай павінны быць знаёмы кожны рабочы падростак, комсамольскі, партыйны, профэсыйны і савецкі працаўнік, урачы і пэдагогі, толькі тады яны будуць мець поўнае ўяўленьне аб тэй вялікай працы, якая прадстаўіць пры практычным разьвязваньні пытаньняў аховы працы, быту і здароўя рабочай моладзі“.

Гэта бязумоўна так.

Б. Брадоцкі.

І Сталін.—Аб комсамоле.—36 ст., ц. 8 коп.

Вось кніжка, з якой павінен быць знаёмы кожны комсамолец Яна зьяўляецца зборнікам артыкулаў і прамоў т. Сталіна, прысьвечаных нашаму саюзу.

Артыкул „Аб задачах комсамолу“ уяўляе сабой адказы на запытаньні дадзенныя тов. Сталіну рэдакцыяй „Комсамольскай Праўды“. У гэтых адказах яскрава абмалёваны важнейшыя задачы, якія стаяць перад комсамолам у сучасны момант.

Як павінен расьці Комсамол, якую ролю граюць у нашым Саюзе парткіраўніцтва і партыйны асяродак, як выхоўваць рабоча-сялянскую моладзь у духу Ленінізму, якім чынам увязаць тэорыю з практыкай—вось на якія жыцьцевыя і злабадзённыя пытаньні дае тав. Сталін вычэрпваючыя адказы.

Другі артыкул аб працы і задачах Комсамолу у вёсцы мае таксама вялікую каштоўнасьць. Тав. Сталін падрабязгова спыняецца на тым, што павінен рабіць комсамольскі актыў на вёсцы і лічыць, што „апошні, пры яго ўмелым скарыстаньні, можа скласьці вялікую сілу, здольную рабіць цуды“. Нам здаецца, што некаторыя вясковыя комсамольскія ячэйкі зьбеглі бы шмат якіх памылак, азнаёміўшыся з гэтым артыкулам тав. Сталіна. Комсамолец на вёсцы—першы актывіст і прыкладнейшы гаспадар—вось які вывад робіць тав. Сталін.

Як вядома, опозіцыя у прыватнасьці тав. Троцкі, у сваёй барацьбе супроць большасьці партыі, імкнуліся выкарыстаць Комсамол у сваіх мэтах, спрабавалі пасварыць апошні з партыяй. Артыкул „Некаторыя памылкі тав. Троцкага“ выкрывае ўсю нежыцьцёвасьць і блытаніну доваду опозіцыі ў пытаньні аб моладзі (узяць хаця б вядомую стаўку тав. Троцкага на вучнёўскую моладзь) і робіць зразумелым, чаму Комсамол даў такі аднадушны адпор усім опозіцыйным выступленьням.

Вельмы добра зрабіла Выдавецтва „Чырвоная Зьмена“ выпусьціўшы гэту кніжку. Пажадана бачыць апошнюю ў руках кожнага комсамольца.

Я Зэльцар.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ, А. КУРЦІК

Галоўлітбел № 23706 2-ая Дзярждрукарня БДВ.